# Краіна здароўя

Выпуск №14 (367)

■ Асаблівасці захворвання

## ГЕПАТЫТ НЕ ДРЭМЛЕ, АЛЕ І МЫ НЕ СПІМ

**Элементарныя правілы гігіены і вакцынацыя павінны засцерагчы ад самых распаўсюджаных відаў гепатыту — А, В і С**

«Падхапіць» вірусныя гепатыты В і С даволі проста — яны перадаюцца праз невялікую колькасць крыві, і гэта не абавязкова ін'екцыйнае ўжыванне наркотыкаў і сексуальныя кантакты. Чысціць зубы чужой шчоткай, расчэсваць валасы чужой расчоскай дакладна не варта: уладальнік гэтых прылад і сам можа не ведаць, што з'яўляецца носьбітам захворвання. Наогул, чым больш рызыкоўныя паводзіны вы практыкуеце, тым большая верагоднасць заразіцца. Ужыванне любых наркотыкаў (не абавязкова ін'екцыйных), злоўжыванне алкаголем — усё, што дапамагае нам страчваць кантроль, прыводзіць да рызыкоўных паводзінаў (тут і бойкі, і выпадковыя палавыя сувязі). Што датычыцца гепатыту А, то ён трапляе ў арганізм з забруджанай вадой або прадуктамі, што магчыма, у першую чаргу, у трэціх краінах з нізкім узроўнем жыцця, медыцыны і санэпідгляду. А таму заўсёды будзьце ўважлівымі да свайго рацыёну, асабліва падчас замежных вандровак.

Супраць гепатытаў А і В у нашай краіне праводзіцца вакцынацыя немаўлят, што забяспечвае ім у далейшым стапрацэнтную абарону. Аднак гепатыт С застаецца для вучоных сур'ёзнай праблемай — ён надта зменлівы, каб вынайсці такую абарону. Ратуюць толькі эфектыўныя схемы лячэння.



Праўда, гепатыт В, калі ўжо трапляе ў арганізм, то застаецца там на ўсё жыццё — лячэнне толькі дапамагае зрабіць так, каб ён не аказваў шкоднага ўздзеяння на здароўе.

Вірусныя гепатыты В і С вельмі часта могуць працякаць бессімптомна, і толькі падчас абследаванняў можна выявіць антыгены, якія сведчаць за тое, што некалі арганізм з імі пазнаёміўся. У краіне выяўлена каля 40 тысяч пацыентаў з вірусными хранічнымі гепатытамі В і С. Сусветная арганізацыя аховы здароўя сцвярджае, што толькі 5 працэнтаў інфіцыраваных ведаюць пра свой дыягназ. Аднак нашы спецыялісты сцвярджаюць, што дзякуючы скрынінгу груп рызыкі сітуацыя нашмат у Беларусі лепшая. 17 катэгорый грамадзян, напрыклад цяжарныя, усе, хто пражывае з такімі хворымі, хто знаходзіцца на гемадыялізе і г.д., абавязкова абследуюцца на вірусныя гепатыты.

А ўсё таму, што вострая форма захворвання даволі хутка пераходзіць у хранічную, а гэта паступова можа значна пашкодзіць печань, абумовіць развіццё цырозу і раку. Праўда, у пэўнай частцы вострых выпадкаў гепатыту С назіраецца самавылечванне. Ды і калі выявіць захворванне ў вострай форме, сучасныя схемы лячэння даюць добры эфект. «У краіне зарэгістраваны шэраг прэпаратаў, якія дазваляюць пазбавіцца ад самага распаўсюджанага сярод вірусаў гепатыту — С, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы г. Мінска Святаслаў ВЕЛЬГІН**. — Першую ін'екцыю пацыент атрымлівае ў стацыянары, дзе даследуюцца пабочныя рэакцыі, а далей прызначаецца курс лячэння працягласцю ад паўгода да года. У свеце ўжо прымяняюцца новыя прэпараты з меншымі пабочнымі эфектамі і большай эфектыўнасцю. Некаторыя з іх ёсць і ў нашай аптэчнай сетцы. Акрамя таго, зарэгістраваны і пачнуць да канца года выпускацца яшчэ два прэпараты супраць гепатытаў В і С».

### Гэта важна

✓ Любая працэдура, звязаная з пашкоджаннем скуры — пірсінг, тату, лячэнне зубоў, стрыжка ў цырульні, — з'яўляюцца патэнцыйнай пагрозай. Аднак рызыка становіцца мінімальнай, калі ўсё гэта рабіць у афіцыйных установах, дзе працуюць спецыялісты з адпаведнай адукацыяй, праводзіцца адпаведны санітарны нагляд, робіцца ўсё неабходнае для прафілактыкі заражэння (аднаразовыя пальчаткі, аднаразовы інструментарый, гігіена рук, прыборка). Па сутнасці, кожны павінен паводзіць сябе з улікам патэнцыйнай небяспекі, а сам інфіцыраваны — памятаць аб адказнасці за наўмыснае заражэнне.

✓ З асцярожнасцю трэба паводзіць сябе не толькі ў азіяцкіх краінах, але нават у еўрапейскіх. Праблема гепатытаў будзе захоўваць сваю актуальнасць там, дзе шырока ўжываюць любыя наркарэчывы і дзе распаўсюджаны аднаполыя шлюбы.

✓ Леташняе апытанне захварэлых паказала, што 20 працэнтаў маглі, на іх думку, заразіцца праз палавы кантакт; 11 працэнтаў звязваюць магчымасць інфіцыравання вірусным гепатытам з ін'екцыйным ужываннем наркотыкаў; 9 працэнтаў — з пэўнымі маніпуляцыямі кшталту наведвання цырульні; 2,5 працэнта — з выпадковым пашкоджаннем скуры (кантактна-бытавы шлях).

■ Парады для кожнага

# ШТО З СЭРЦАМ?

**Захворванні сістэмы кровазвароту па-ранейшаму лідзіруюць у структуры смяротнасці — 51—55 працэнтаў выпадкаў гібелі маюць у аснове гэту прычыну. Што рабіць, каб мы жылі як мага даўжэй без падобных праблем, і чым медыцына здольная дапамагчы ў выпадку іх узнікнення? Расказвае дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК.**

### Будзе яшчэ больш?

— У шэрагу заходніх краін працэнт смяротнасці ад захворванняў сістэмы кровазвароту меншы, але там інакш складаецца статыстыка. Так, у ЗША 18 працэнтаў усіх выпадкаў смерці насельніцтва звязваецца з цукровым дыябетам. У нас — 3 працэнты. Бо хворыя на цукровы дыябет гінуць менавіта ад сардэчна-сасудзістай паталогіі.

**Сімптом вельмі просты — боль за грудзінай, які не спыняецца. Здаецца, толькі пазвані. Не, чакаюць або панядзелка, або калі само пройдзе...**

Ад хвароб сістэмы кровазвароту ў нашай краіне пакутуюць 2 млн 470 тысяч чалавек. Гэта 26 працэнтаў ад усяго насельніцтва, або 32 ад дарослага. Наогул захворванні сэрца і сасудаў наўпрост звязаныя з узростам. Мы сёння намагаемся павялічыць сярэднюю працягласць жыцця да 75 гадоў, а таму заканамерна павінны чакаць і росту такой паталогіі. І быць гатовымі да аказання дапамогі такім пацыентам.

### Лідары па курэнні?

— Калі б насельніцтва нашага абласнога горада кінула курыць, то колькасць выклікаў «хуткай дапамогі» зменшылася б там на 15 працэнтаў. Менш стала б вострага каранарнага сіндрому, гіпертанічных крызаў... Хто ў нас не ведае, што курыць дрэнна, але мы ўсё роўна застаёмся адной з самых тытунёвазалежных краін. Ампутацыі ў хворых на цукровы дыябет, якія кураць, здараюцца ў 5 разоў часцей. Анкалогія розных формаў, не толькі рак лёгкага, — таксама ў разы часцей. Я агрэсіўны ў дачыненні да курэння. Таму што клінічная медыцына стала вельмі дарагой...

### Па сацыяльных прычынах?

**— Важную ролю ў развіцці сардэчна-сасудзістых захворванняў адыгрывае сацыяльны фактар — урбанізацыя, працоўная занятасць, палітычная сітуацыя. Скажам, пасля распаду Савецкага Саюза адбыўся ўсплёск такой захваральнасці ва ўсіх яго краінах, у тым ліку ў Беларусі...**

У нашым цэнтры сёння робіцца практычна ўсё, што выконваецца ў свеце, але ўсе гэтыя складаныя ўмяшанні — работа з хворым чалавекам. Яму патрэбна ўжо толькі другасная прафілактыка... А як зрабіць, каб гэты чалавек не захварэў, каб ён не курыў? Патрэбны не забаронныя меры, а комплексны падыход, без папулярызацыі шкодных звычак. Вазьміце некаторыя папулярныя серыялы: палічыце, колькі там выпіваюць! Нам жа патрэбна фарміраваць іншы стэрэатып: чым менш у мяне фактараў рызыкі, тым больш я буду працаваць, атрымліваць матэрыяльных выгод, даўжэй буду жыць... Вядома, што Форд штрафаваў сваіх работнікаў-курцоў і аддаваў грошы тым, хто не курыць. Неблагая матывацыя!

### Лішак алкаголю — раптоўная смерць?

— Спажыванне алкаголю — таксама істотны фактар рызыкі абвастрэння працякання сардэчна-сасудзістага захворвання. Калі мы хочам атрымаць часцей раптоўную сардэчную смерць (а гэта сёння 20 працэнтаў ад усіх выпадкаў гібелі ад сардэчна-сасудзістай паталогіі), то можна працягваць злоўжываць у тых жа аб'ёмах. Урачы ўжо даўно кажуць пра «святочнае сэрца» — тая ж «хуткая» выклікаецца часцей менавіта ў дні свят.

Калі ў вас ёсць артэрыяльная гіпертэнзія і вы злоўжываеце, значыць вы паскараеце наступленне гіпертанічнага крызу, інсульту. Калі ў вас арытмія, то на высокай дозе алкаголю можа быць раптоўная смерць.

### А нармальнага ціску не дасягаем?

— Пацыенты з артэрыяльнай гіпертэнзіяй сёння досыць актыўна бяруцца на ўлік, але што далей? Аналіз медыцынскіх картак асоб, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку з такім захворваннем, паказвае, што 87 працэнтаў пацыентаў інфармаваныя аб наяўнасці ў іх фактараў рызыкі развіцця той жа гіпертэнзіі, 64 працэнты з іх штодня прымаюць адпаведнае лячэнне, але дасягаюць мэтавага ўзроўню (прымаюць так, каб ціск быў нармальным) усяго 30 працэнтаў! Чалавек ведае аб сваёй праблеме, але не хоча лячыцца, а калі хоча і лечыцца, то робіць гэта няякасна. А гэта што ў перспектыве? Інсульты і інфаркты.

### Можа, лекі не тыя?

— Мы сёння працуем паводле доказнай медыцыны. Гэта азначае, што прэпараты, якія выкарыстоўваюцца, даказалі сваю эфектыўнасць і бяспеку. Прайшлі маштабныя, складаныя, незалежныя даследаванні. Калі вы хочаце атрымаць эфект, значыць павінны карыстацца менавіта такімі прэпаратамі.

Наогул псіхалагічны фактар у фармакатэрапіі адыгрывае важную ролю. Можна па-рознаму прызначаць прэпараты. Як вы думаеце, з якімі думкамі будзе лячыцца пацыент, калі яму сказаць: «Ведаеце, яшчэ нікому не дапамагала, але паспрабуйце»?

### Як дапамагчы пры інфаркце?

— Ці можам мы дапамагчы чалавеку з вострым інфарктам міякарда? Можам! Пачынаючы з 2011 года мы ўкаранілі практыку выкарыстання ангіёграфаў — апаратаў, якія дазваляюць паглядзець стан сасудаў, увайсці ў сасуд, які аказаўся закрытым і дзе з гэтай прычыны пачаў развівацца інфаркт, аднавіць кровазабеспячэнне і прадухіліць ускладненні. Калі гэтага не зрабіць, то разаўецца інфаркт. Ад дыяметра сасуда залежыць, якая плошча міякарда загіне: калі ён буйны — вялікая, а значыць, гэта рубец, які абмяжуе здольнасць сэрца нармальна скарачацца, што справакуе небяспечную для жыцця арытмію і сардэчную недастатковасць.

У нас ёсць прыкладна 1 гадзіна для таго, каб прадухіліць увесь гэты небяспечны ланцуг. У Мінску гэта цалкам рэальна, бо працуюць пяць цэнтраў для правядзення такога абследавання. Ёсць ангіёграфы і ў абласных гарадах, паступова ствараюцца яны і ў іншых буйных гарадах. Але што мы бачым сёння з боку саміх пацыентаў? У першыя 6 гадзін развіцця вострага каранарнага сіндрому пазванілі ў «хуткую» ўсяго 55 працэнтаў хворых! Значыць, хворыя нашы трываюць, не ведаюць! А сімптом вельмі просты — боль за грудзінай, які не спыняецца. Здаецца, толькі пазвані. Не, чакаюць або панядзелка, або калі само пройдзе...

### Што трэба рабіць?

— Фактары рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістай паталогіі і гібелі ад яе ўсім добра вядомыя. Для мужчын гэта на першым месцы алкаголь, затым тытунь, павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, высокі індэкс масы цела, недастатковае ўжыванне садавіны і гародніны, недастатковая фізічная актыўнасць. Для жанчын — павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, высокі індэкс масы цела, недастатковае ўжыванне фруктаў і гародніны, нізкая фізічная актыўнасць, алкаголь.

СААЗ рэкамендуе для прафілактыкі большасці сардэчна-сасудзістых захворванняў:

1. Кантраляваць артэрыяльны ціск і ўзровень халестэрыну.
2. Наладзіць рацыянальнае харчаванне і не набіраць вагу.
3. Займацца фізічнай культурай.
4. Не пачынаць курыць або тэрмінова кінуць.
5. Абмежаваць алкаголь.
6. Вучыцца перамагаць стрэсы.

### Якія яны — сучасныя аперацыі?

— Мы назапашваем вопыт пастаноўкі клапана ў сэрца праз артэрыю або вену. Без разрэзаў. Развіццё інтэрвенцыйных тэхналогій адбываецца неверагодна хутка. Але гэтым займаюцца не кардыяхірургі, а рэнтгенэндаваскулярныя хірургі. Яны лечаць востры інфаркт з дапамогай пастаноўкі стэнта ў перакрыты сасуд. Праз вену і артэрыю яны маніпулююць, што называецца, ва ўсім сэрцы. Раней для аператыўнага лячэння анеўрызмы аорты трэба было рабіць вялікі разрэз. Дый сама аперацыя да 8 гадзін магла цягнуцца. А сёння праблема вырашаецца шляхам умацавання аорты праз артэрыю. І аперацыйнай раны няма. Можна, напрыклад, знайсці ў сэрцы ачаг, які правакуе парушэнне рытму, дабрацца да яго праз артэрыю або вену і «прыпячы» высокай тэмпературай. Усё гэта абсалютна новыя напрамкі. Гэта прынцыпова іншая падрыхтоўка спецыялістаў

■

■ Медыцынскі турызм

## ЛЕГЕНДА ВОЗЕРА ПЛІСА

### На які наш санаторый не шкада патраціць немалыя грошы?

**Літаральна месяц таму ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці адкрыўся санаторна-курортны комплекс «Пліса», кошт пражывання ў якім на чалавека — ад 55 долараў за суткі. Новы санаторый размясціўся за 180 км ад Мінска і трапіў у пяцёрку самых дарагіх устаноў для аздараўлення. Можа, дарэмна? Разбіраліся журналісты, запрошаныя на экскурсію Нацыянальным прэс-цэнтрам.**

Санаторый з'явіўся на месцы былой вайсковай часці, непасрэдна на беразе ляснога возера Пліса (7 км на 1,5 км), непадалёк ад вёскі з аднайменнай назвай. Вада чыстая, ёсць рыба — лешч, лінь, вугор, шчупак, судак. Буйкі даволі блізка, і там ужо істотная глыбіня. Пляж дагледжаны, уладкаваны, з асінавым насілам для прыняцця сонечных ваннаў, ёсць і парасоны, тапчаны. Адыходзім ад пляжа ў напрамку пірса. Не жадаеце пракаціцца? На катамаране — 4 рублі за гадзіну, на лодцы — 3, на катары — 10 рублёў за 10 хвілін, і гэтага хопіць, каб пабачыць невялічкія астраўкі, раскіданыя па вадзе як велізарныя зялёныя букеты. Налета плануецца пашырыць парк водных сродкаў перамяшчэння — байдаркі, каноэ, яхта. Не ўмееце гэтым кіраваць? Інструктар навучыць.

Падзялілася Пліса з людзьмі і сваімі лекавымі гразямі. Скарб здабываюць і адразу пускаюць у справу — на лячэнне захворванняў мышачна-касцявой сістэмы. Куды больш эфектыўна, чым тая сыравіна, што завозіцца ў краіну здалёк...

Ідзём ад возера па выкладзенай пліткай сцяжынцы... у бювет, дзе тройчы на дзень рэкамендуецца піць натуральную мінеральную ваду. На смак нязвыкла, але карысна для страўнікава-кішачнага тракту і нармалізацыі функцыі нырак. Наогул на тэрыторыі санаторыя — дзве свідравіны з мінеральнай вадой. Ёсць яшчэ вада з высокай канцэнтрацыяй брому для вонкавага прымянення, што рэдкасць на нашых тэрыторыях (самы блізкі аналаг — у Юрмале). Бромістыя воды карысныя ў выглядзе ваннаў для аздараўлення органаў кровазвароту, нервовай і мочапалавой сістэмы. Ёсць і свая крыніца здабывання лячэбнай сапрапелевай гразі.

Перад намі — аб'ект недзяржаўны. Узвядзеннем займаўся «Трэст Прамбуд», які прыцягнуў значную долю крэдытных сродкаў. Усяго за некалькі гадоў работ было асвоена каля 20 мільёнаў долараў. Трэст заваяваў сабе сур'ёзную рэпутацыю на аб'ектах элітнага жылля, узвядзенні храма-помніка ў гонар Усіх Святых...

Галоўны корпус санаторыя з вышыні птушынага палёту паўтарае, дарэчы, Крыж Еўфрасінні Полацкай. А калі апусціцца ўніз, то паміж прыгожымі клумбамі і дэкаратыўнымі масткамі ўбачым і капліцу ў яе гонар. Хіба магло быць інакш на зямлі, дзе знаходзяцца Полацкі Сафійскі сабор і Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр — усяго за 70 км ад вёскі Пліса.

Санаторна-курортны комплекс пабудаваны ў палацава-паркавым стылі. І стрымана, і велічна, і цалкам арганічна для тутэйшых мясцін. Перад галоўным корпусам — фантан з кампазіцыяй «дзяўчынка і матылькі». У самым цэнтры гэтага корпуса — круглае памяшканне, светлае і ўрачыстае, з велізарнымі хрустальнымі люстрамі, якія каскадам спускаюцца з пяціпавярховай вышыні. Гэта рэсепшн, дзе можна пасля папярэдняга бранявання хутка аформіцца і аплаціць пуцёўку. Калі ехаць з Мінска, то 2,5 гадзіны — і вы на месцы (машыну можна пакінуць на бясплатнай паркоўцы).

— Аднапакаёвы стандарт — з добрай сучаснай мэбляй (ложак, шафа, пісьмовы стол, крэсла), кандыцыянерам, тэлевізарам, тэлефонам з гарадской і міжнароднай сувяззю, фенам і гігіенічнымі сродкамі ў ванным пакоі, плошчай 15 кв. м каштуе 110,5 рубля за суткі на чалавека (да любой сумы трэба дабаўляць 5 працэнтаў курортнага збору). Двухмесныя нумары на дваіх — 205-240 рублёў. Ёсць і апартаменты: у двухпавярховым катэджы — з двюма спальнямі, асобнымі ваннымі пакоямі, гасцёўняй, кабінетам і кухняй (такіх катэджаў пяць) або аднапавярховыя, у якіх дапускаецца размяшчэнне да шасці чалавек, — тлумачыць першы намеснік генеральнага дырэктара «Трэст Прамбуд» Валерый МАЗОЎКА.

На ложках — халаты і ручнікі, у шафах — тапачкі. Усюды ёсць кандыцыянеры, тэлевізары і вельмі добры Wi-Fi — такі, што можна не адрывацца ад любімых сетак нават на пляжы.

Трохразовае харчаванне — на ўзор шведскага стала, гатуюць смачна, хоць выбар страў і фруктаў пакуль небязмежны. Няма і сейфаў, але калі прыехаць толькі з пластыкавай карткай, то не прагадаеш: у галоўным корпусе ёсць аддзяленне аднаго з банкаў.

Бар — прасторны, частка столікаў размяшчаецца на вуліцы, так што ў добрае надвор'е можна ўзяць кавы або чагосьці мацнейшага і атрымаць асалоду на свежым паветры, разглядаючы азёрную прыгажосць.

Тэлебачанне багатае на колькасць каналаў, але, як на маю думку, то лепей больш часу прысвяціць шпацырам па сцяжынцы здароўя ды спартыўным забавам — ёсць пляцоўкі для гульні ў вялікі тэніс, валейбол, футбол, хутка дабавяцца і некалькі вулічных трэнажораў. Непадалёк — гульнявы комплекс для дзяцей. Ракеткі для настольнага тэніса, дартс, набор для «гарадкоў» выдаюцца бясплатна. Тэнісны корт каштуе 15 рублёў за гадзіну, веласіпед — 3, палкі для скандынаўскай хады — 1,5 рубля за гадзіну (інструктар дапаможа разабрацца, што і як рабіць правільна).

У кошт пуцёўкі ўключаны і базавы камплект аздараўленчых працэдур. Можна аплачваць штосьці і дадаткова. Але больш за тры-чатыры працэдуры ў дзень праходзіць не рэкамендуецца.

— Мы ставім перад сабой задачу навучыць людзей правільна харчавацца, адпачываць і аздараўляцца — у гэтым маюць патрэбу абсалютна ўсе, — кажа галоўны ўрач санаторнага комплексу Сяргей ПЕТУХОЎ. — А такое магчыма менавіта ў сваёй роднай кліматычнай зоне, дзе няма дадатковага стрэсу з-за адаптацыі...

У кошт пуцёвак уваходзіць наведванне аквазоны. Праз дзень чаргуюцца працэдуры з мінеральнай вадой і грязі. Плюс штодня адна фізіяпрацэдура, праз дзень — масаж па 15 хвілін, трэнажорная або фітнес-зала.

Тры паверхі ў галоўным корпусе — цалкам лячэбныя. Першы і другі — водагразелячэбніца. Вось тут і накладваюцца гразевыя аплікацыі на хворыя суставы, прымаюцца лячэбныя ванны з мінеральнай вадой, бішафітам, валяр'янай, развадныя гразевыя (гразі разводзяцца мінеральнай вадой). Сухая вуглякіслая ванна — карысны стрэс для дробных сасудаў, што паляпшае ў выніку кровазварот, аздараўляе скуру і забяспечвае антыцэлюлітны эфект. Спецыяльная ванна — для гінекалагічных працэдур. Тут жа басейн, парылкі і зона «штучнага сонца». Устаноўка «штучнае сонца» (шведская вынаходніцтва) дазваляе цягам аднаго сеанса (для 8-10 чалавек) атрымаць увесь спектр сонечнага святла за выключэннем ультрафіялету. Словам, не для загару гэта, а для прафілактыкі сезонных дэпрэсій, лячэння сіндрому хранічнай стомленасці.

Фота Алеся ШАРШНЁВАЙ.

На трэцім паверсе — урачэбныя кабінеты, фізіятэрапеўтычны і масажны блокі.

Фізіятэрапія, напэўна, рэдка дзе прадстаўлена так шырока. Ёсць і эксклюзіўнае абсталяванне. Вібратэрапія (для расслаблення мышцаў, суставаў), устаноўка для бескантактнага гідрамасажу ад пятак да шыі, біярэзанансная тэрапія з некалькімі рэжымамі ўздзеяння з дапамогай электродаў (можна і тлушч «спальваць», і з абстынентнага сіндрому вывесці).

Масажныя сталы — трансформеры. Няважна, якога вы росту і камплекцыі, зручна будзе і вам, і ўрачу. Адзін мінус — спецыялістамі пакуль не ўкамплектаваныя. Зона СПА-працэдур яшчэ даводзіцца да ладу.

«Пачынаем адначасова і другую чаргу будаўніцтва — для самабытнага адпачынку, — расказвае Валерый Мазоўка. — Легенда сведчыць, што Рагнеда спрабавала схавацца ад князя Уладзіміра на адным з тутэйшых астравоў. А калі ёсць легенда, значыць, павінен быць і замак з пад'ёмнымі мастамі, з персаналам у касцюмах тых часоў... А ў гонар усіх нацыянальнасцяў, якія некалі тут пражывалі — ліцвінаў, палякаў, рускіх, украінцаў, татараў, яўрэяў, цыганоў, зробім некалькі домікаў, у якіх можна будзе пабачыць іх побыт. На гэтай тэрыторыі будзе свая гасцініца. Ёсць надзея, што налета ўжо вы ацэніце нашы намаганні».

Матэрыялы падрыхтавала **Святлана БАРЫСЕНКА.**